1Ба
60965

МАЛАДНЯК.
№ 2

# ТАМ, ДЗЕ КІПАРЫСЫ



УЛАДЗІМЕР ДУБОЎКА

1 Ба
60965
~~№ 104~~
С. И. Котов...

№ 2 КНІЖНІЦА „МАЛАДНЯК“ № 2

ЎЛАДЗІМЕР ДУБОЎКА

БИБЛИОТЕКА
№ 1331
В. С. Котовича

# ТАМ, ДЗЕ КІПАРЫСЫ

## ПОЭМА

ВЫДАНЬНЕ ЦБ МАЛАДНЯК
МЕНСК—1925

Надрукавана ў 1-ай
Дзяржаўнай друкарні
ў ліку 1500 экз.
Галоўлітбел № 8884
Заказ № 1390

Прысьвячаю
Кастусю Станкевічу

# ТАМ, ДЗЕ КІПАРЫСЫ

Дзяўчыне прысьвяціць поэму?
Адразу скажуць: „нешта ёсьць!“
Правадыру якому?—„Пэўна
падмазваецца ягамосьць!“
Сьмяешся, Костусь?—Мне казалі
аднойчы „добрыя сябры“...
Дык вось у крымскім футарале
табе зьвініць хай гэты рытм.
Успомніш, як галадамірыў
калісьці разам ты са мной.
Я пачынаў іграць на ліры
тады. І гукі піў—нагбом...
Тады й сухоты пачаліся...
А працу мы вялі з табой!
Змаганьне за сутоку выйсьця
штандарыла над галавой...
Аб чым яшчэ тады мы дбалі?
Каб вызваліць свой родны кут!
Як быццам моцна клалі палі,
а Захад—і цяпер таўкуць...

Няхай! Націсьнем на кардоны,
яшчэ ня стыне ў сэрцы кроў.
Сабе яны кладуць прадоньне
ў Заходняй Беларусі, скрозь...
Дык вось. Сьпяваю сёньня Поўднем,
бо ён—імпэт пакуль адзіны,—
каб, можа песьняй лебядзінай,
успомніць Віленшчыну, Нёман...
Пара ўжо распасьцерці крыльле,
касьцёр распаліць моцны прысак;
І ты казаў...
Пачатак быльны:
інося там, дзе кіпарысы...

№ 104.

## 1.

Усё звычайна, і ўсё так проста.
Нават дзіву даешся часам.
То спатканьне, то раптам—ростань.
Бачыш-сьцежка ізноў завілася...

Нешта жаліцца: нешта, дзесьці...
Ды за словы ня хваляць такія.
Калі дванаццаць-мінула дзесяць.
Хто дайлідзіць духу трыкліні?..

## 2.

Хвалі-цёмныя; скрозь-празрыстасьць.
Кіпарысамі бераг ускрыў
поўдзень. Трапілася ж гэта прыстань
адначасна са словам: Крым!

Жыў сабе ў балатох і—годзе.
Пацягнуўся на сьвету край.
І чаго?—Гора таксама ходзіць
тут, аж да гор, да хмар.

Праўда, хмары іншыя. Нават колер
не падобны. А горы схапілі іх
і ў блакіце кадзяць. Памалу і скора...
Дык таму і горад заціх?

Хвалу шлюць тыя самыя горы
небу сінему... Сонцу... Усім...
Шастаньне хмар на хорах агорне
ці-ж так, як трапыханьне асін?

Але-ж не, то іншае: хвалі,
гэта хвалі на пярэсты жвір...
Хай барвуюцца, хай крышталяць,
як восень занізьзю журавін...

## 3.

Над хатай хату вынес бераг,
галоту стрэхі туляць, і,
зусім ня тое на паперы:
штодзённае змаганьне, ці...

Што прыгажосьць ім навакольля,
праменьне сонца, казка ўся,—
пытаньне катаваньнем коліць:
каторы будзе дзень сьсякаць...

Дзяўчына вышла перш за сонца:
бялізну вешае сушыць...
Якая проза... на вяроўцы?
Але, але: вучыся жыць!

Павешала, парасьпінала...
Хай сохне! Залатоўка ёсьць
на скумбрыю і на кавалак
хлеба... Вось крымскае жыцьцё!

Пашла уніз. Каменьне-сходкі.
Палітуравалі іх вякі.
Ніжэй-паветра водар вохкі
і жвір, і твань, і сьпеў марскі.

## 4.

Прыгожая наўзьдзіў дзяўчына.
Поэт... Казаць, ці можа не?
Такая заўсягды прычына
шукае дзіва і ў багне.

Але яна—на выключэньне.
Асмужана ад рук да ног.
Прадоньне мора з воч зачэрпнеш
цямней, чым кос тугіх вянок.

Дык распляла тугія косы,
дык села на пясок марскі.
Зьвіваньнем рук пясок той косіць;
на пеляне яго раскінь...

Нядаўна быў зусім сьцюдзёны,
бо ноч жадала: так было.
Цяпер—скранула дзеўча скроняй;
у асяродку ночы лёд.

Пылаюць праз паркаль калені,
гарачая крынічыць кроў.
І думкі... і куды імкненьні...
Прэч думкі! І той жвір-далоў...

Каменьчыкі лятуць у мора.
Адзін...
другі...
адзін...
другі...
Хвіліну з хваляй пагаворадь
і—
толькі на вадзе кругі...

Адзін...
другі...
На мора...
ў хвалі...
Далей...
далей...

яшчэ далей...
І думак разьвіла каралі.
Ці можа стала весялей?

Устала. Узяла апошні.
Апёрлася, аж пальцы ў жвір.
На гэтай цёмна-сіняй пожні
яго сьлядоў ня знойдзе зірк...

## 5.

Дзяўчына! заўтрака нанова
каменьчыкі, і думкі, ўсё...
Ўжо распранулася і голай
стаіць на шэрых камянёх.

Над пенай белай, пенай пухкай
далёка вока ймклівіць лёт.
Ракочуць хвалі важка, глуха,
як пушчы наскае гальлё.

Зірнула—неба з морам сінім
нітуюцца, дзе небасхіл.
Так радасьць з горам... (Хто адкіне
ад песьні беларускай сквіл?).

Зірнула—хто рашчэпіць злую
нітаванасьць радасьці з тугой?
Незадаволена зірнула
і ў зірку мільгануў агонь.

Ты паплывеш туды, дзе рыса,
дзе цёмна-сіні небасхіл?
Але,—ўспаветрыліся пырскі
і стан у вільгаці застыў.

Асмуглая мая дзяўчына,—
вось ты лягла, вось ты лягла!
Размах рукі шляхі адчыніць;
прастор бунтарыць галава.

Надводзяцца са сквілам чайкі,
а ты—
далей...
далей...
далей...
Дэльфіны мітусяць акрайкі.
Яшчэ далей....
далей...
далей...

Чаму спынілася зьненацку?
А можа тут зваліўся той
каменьчык, што пачаў імчацца
ўспаветраны тваёй рукой?

Ці можа больш ня хопіць змогі?
Надзеі можа больш няма?
Асмугласьць рук лягла на ногі
і кармазыніць вуснаў мак...

## 6.

Чакае брат малы на жвіры,
кусае з сонцам памідор.
—Чаго ў такія лезеш віры,
сястра мая? Прастору досьць

ля берагу, ля пены пухкай.
Баюся я плысьці туды...
Як ракавіна-поўна вуха
марскога шуму і жуды...

Яна ні слова не сказала,
лягла на вопратку сваю.
І сьцені слаліся на скалах;
здавалася, што лёс снуюць...

—Чаго ў такія лезеш нетры,
сястра мая?—Прастору досьць
ля берагу...
Глытаў паветра
і з сонцам нішчыў памідор...

Яна ні слова не сказала,
бо млявасьць спавіла суздром.
А сьцені слаліся на скалах;
здавалася: зьнямога скрозь...

Вось апранулася лагодна.
Пашла бялізну паздымаць.
Якая проза... Як вам згодна:
адказ такі...

## 7.

Дачушка, навальніца будзе
вялікая... На сонца глянь:
на захадзе у хмарах блудзіць;
Ай-Петры апавіў туман...

Цераз жыцьцё разоў ня многа
бачыла захад я такім...
З гор пасуваўся немы рогат:
вецер наземіўся і кпіў...

Маці прышла ад цяжкай працы:
хлеб, вінаград—вячэра іх.
Ад хаты адыйсьці баяцца:
селі на ўзвышшы утраіх.

І наступнее ноч за стадам,
ахутала прасьцяг крылом.
Ня змоўклі ў камянёх цыкады:
іх лямант хлудаліць стралой.

Прабіўся месяц па-над морам,
на хвалях сьцежку прамасьціў.
А горад... Ня сьціхае горад,
бы вецер у марскім трысьці.

БИБ... ЕКА №1331

Паветра душыцца сьпякотай,
як пылам над сахой ратай.
Ня кінуў водарыць ля плоту
паўднёвавейнасьцю платан.

А маці пачынае правіць,
мінулае успамінаць.
А вецер мора кучаравіць,
на дне віхурыць сенажаць.

—У часе буры мкнецца хіжа
на бераг мора заўсягды.
І скалы крышыць, скалы ліжа;
на скелзы скал кладзе дары.

Ракавіны і багавіньне,
каралі ракавін і—твань
ад шчырасьці на бераг кіне
пакуль залева і туман.

У нетры-ж цягне ўсё жывое:
адмену трэба даць яму...
Дык вось: сіротамі затое
Пакінула і вас... Чаму?

Зьбіраў ваш бацька падарункі
у самы навальнічны час.
Зьвіліся хвалі, бы карункі...
Дык слухай, сын... сумуй, дачка...

Любіў ваш бацька горы, „Дзіву“,
Ай-Петры бацька ваш любіў...
На ўзвышшы ўсё сядзеў маўкліва;
адтуль відаць і дно глыбінь...

Адтуль глядзеў на ўсход, на захад,
на сухазлоцьце Скутары.
І гэта пазбаўляла страху:
прадоннае пазнаў стары.

Але каршун на ноч накрумкаў,
магнолію заваражыў.
Зьвіліся хвалі, бы карункі...
І ў сэрцы матчыным-нажы...

Было. Няма. Дык вось зьбіраюць
у навальнічны час дары...
Заціхла: сьпіць ужо старая.
А неба полымем гарыць...

— Сястра мая,—
гаворка брата,
пайду і я на бераг той...
— Кладзіся! Пойдзем, пэўна, заўтра,
бо... трэба есьці, мой браток...

8.

Праз мур, праз тын, да стрэх, на хаты
салёныя ўзьлятаюць пырскі.
Зялёныя праменяць шаты
з сівізнаю на кіпарысах.

З залевай пацякло каменьне
з узвышша. Навальлівіць Крым.
А ноч сьціскае скнарнай жменяй.
Ці думае і сон скарыць?

Яшчэ ня скора з сонцам раньне:
бяз сонца раніца прышла.
Па берагох буруны гралі
і пеніўся ўзьбярэжжа шляк.

Дзяўчына узьняла малога.
— Хадзем...
хадзем...
бо час...
бо час...
Апёрся той малы на локаць,
а вочы—дрвівасьцю блішчаць.



1Ба 60965

Ён сьніў, што з мора на ўзьбярэжжа
плылі... ракавіны плылі.
Цюбіцейка была на першай
і зорачкі на ёй цьвілі...

Другая... вінаград мускатны
ў цьвяціста-бурштыновы колер...
Ах! сны снуюцца, часам складна;
пазбудуцца яны... Ніколі

не забыцца і... не спаткацца...
— Сястра мая... Твой будзіць крык...
Я сьніў... (няўжо й цяпер у хаце?)
і стрэхі бачыў Скутары...

— Хадзем браток...
(пабралі торбы).
— Хадзем на хлеб запрацаваць...
„Манах" ля „Дзівы" плечы згорбіў,
а ракавіны-далавах...

9.

На камень, камень. Шумай зьвіты
ўвесь бераг. Рокат не заціх:
з зямлёю хвалі йшчэ ня квіты,
як за пасагу дзе зяці...

Дзяўчына увашла ў нізіну.
Спавіў туман і вохкі пыл
на постаць вэлюмам ускінуў;
і лашчыцца стагнаньнем кпін.

На ўзвышшы брат парожніць торбы
і вока цешыцца яго.
Такіх цудоўна-стройных, добрых—
ня кратала дасюль далонь.

Ракавіны...
Белыя...
З кропкамі...
З пасамі...
Сінімі...
Лілёвымі...
Чырвонымі...

Дзяўчына—рупна, не марудзіць,
бо мора забірае ўжо:
ў нязьмераным тым ізумрудзе
прыгоршчацца дары каўшом.

А гэта? Дзіва! Гэта—дзіва...
Сьвеціцца ракавіна ўся.
Навошта хвалі гэтай хцівай
нясьці яе, праз жвір куляць?

— Чакай...
                    чакай...
                                        пакінь здабычу...
Нікому не аддась яе
дзяўчына... Вецер сьвішча;
наўколь імжою засяе.

Далей...
                далей...
                        — Чакай-жа, хваля!
Пакінь мне ракавіну ты.
У тваім зялёным футарале
ня ўбачаць вочы пекнаты...

Далей...
                далей...
                            І нікне ў хвалі
цудоўны падарунак дна.

Няўжо адтуль за ім паслалі?
А хвалі...
Хваля не адна...

Як толькі рукі за здабычу—
другая хваля ў ногі б‘е.
Выконваюць марскі свой звычай:
дзяўчыны косы на вадзе...

А трэцяя—цалуе шыю
і ласкай катуе сваей.
Галовамі скал не крышылі
дагэтуль... Пачынаўся дзень.

Заеньчыў на скале, спужаўся
маленькі брат. Ня ведаў, што
салёназлосныя вужакі
прыціснулі жыццё ў рышток.

## 10.

Сьняданьне ты прынесла, маці?
Пачула лямант? Вісьне гас?
Лістом да долу будзеш слацца:
дачка надоўга прылягла...

Як птушка ад рабіны крымскай
на месца, дзе цьвіце кізіл,—
маці ускочыла у пырскі,
ускочыла ў салёны пыл...

— Дачушка...
і цалуе ногі,—
— дачушка...
вусны каля рук.
Цябе палохаў гэты скогат?
Глядзіш навошта на гару?

— Дачушка...
і цалуе грудзі,—
— дачушка...
вусны каля воч.
Чаго на сьвеце гора блудзіць,
як шляхта ля чужых хлявоў?

Укленчыла на твані маці
і вочкі перацалавала...
А вочы—ня хочуць сьціскацца,
і ў вочах—глыбіні кавалак...

А рукі—ракавіну цісНуць
цудоўную. Шуміць яна;
шуміць і днесь і прысна
у ракавіне акіян...

Чаму? Праклёнства гэтай пройме!
Дзяўчына там, дзе небасхіл...
Радасьць і гора у абоймах
імпэт дзявочы прытуліў...

Хто выйдзе раніцай на бераг?
Жвіровы, шэра-жоўты шляк
хадою ўзьнепакоіць? І наберыць
каменьчыкаў, каб з пеляны шпуляць?

## 11.

Ўзьбярэжжа пенай залілося
ізноў. Сьмяешся, маці, ты?
Пазнала, што рабіць?—Інося...
Выходзіць на адвечны тын.

Сьмяешся, маці, ты вясёла...
На брыж раптоўна падышла...
— Дабро назад зьбіраеш, волат?
Вазьмі яго, вазьмі да тла...

І ракавіны раскідала
назад у мора...
— Ўсё вазьмі...
Іх соўкала хвіліна валам,
пасьля... Ў прадоньні многа міль...

— Усё. Здаволілася, злое?
Аддай цяпер, дачку аддай...
Аб чым буруны дзіказвоны,
віруецца чаго вада?

— Аддай...
віюцца гукаў пасмы.
— Аддай...
загаласіў туман.
— маю надзею, шчасьце...
Гасьлі
надзеі. Адказу няма...

Не! Літасьцівае часінай,
пашкадавала бедакоў
мора: пашло ад чорна-сініх
кос; разаслала на пясок

косы...
Глыбей...
яшчэ глыбей...
Спагадаю ўшчувае сэрца:
на жвіры цела застаецца.
Балюча?—больш ня трэ‘ балець.

Пакінула ў руках і тую
ракавіну, на ўспамін.
Радасьць і гора ў ёй нітуе
сіні блакітам небасхіл...

Завошта галаву схіліла?
Але—жыцьцё і сьмерць у хвалях...
Дзяўчыну звалі ўсе Марыляй,
надзеяй маці такжа звала...

## 12.

Магноліі і кіпарысы,
з паўднёвавейнасьцю платан...
У высі думка не парвіся:
ня будзе крытык „прыкладаць“.

Бо швагра паміж іх ня маю.
Дык што! Няхай сабе, няхай...
Свой лёс—вію і разьвіваю;
хто на поэта не брахаў?

## 13.

Змагаюцца з жыцьцём штодзённа,
на мора не кладуць крыжоў.
Пасьцеляцца, бы косы, лёнам,—
„Манах“ націсьне капюшон.

Бразгочуць на руках каменных
каралі жорсткія яго.
Каторы раз шнурок прамерыў,
як сэрца загасіў агонь?

Над хатай хату вынес бераг,
а ў кожнай хаце—непакой.
У той—не зачыняюць дзьверы,
У той—даўно няма вакон.

Што прыгажосьць ім навакольля,
праменьне сонца, казка ўся,—
пытаньне катаваньнем коліць:
каторы будзе дзень сьсякаць...

## 14.

Хвалі цёмныя; скрозь празрыстасьць.
Кіпарысамі бераг ускрыў
поўдзень. Трапілася-ж гэта прыстань
адначасна са словам: Крым!

Жыў сабе ў балотах і—годзе.
Пацягнууся на сьвету край.
І чаго?—Гора таксама ходзіць
там, аж да гор, да хмар.

Праўда, хмары іншыя. Нават колер
не падобны. А горы схапілі іх
і ў блакіце кадзяць. Памалу і скора...
Дых таму і горад заціх?

Хвалу шлюць тыя самыя горы
небу сінему... Сонцу... Усім...
Шастаньне хмар таксама агорне,
як і у нас трапыханьне асін.

На вазёрах таксама хвалі,
хвалі і ў нас на пярэсты жвір...
Дык хай барвуюцца і крышталяць,
можа ў іх напаткае прыгожае зірк...

Масква. 19—21 лютага 25 г.

МІНСК
38 № 67
35000
405814/1991

# Зьмест

*Стар.*

1. Прысьвячэньне . . . . 5—6
2. Там, дзе кіпарысы . . . . 7—30

## ТАГО-Ж АЎТАРА:

1. **Строма**. Вершы. Вільня, 1923 г.
2. **Трысьцё**. Вершы (друкуюцца, БДВ).
3. **Трыкліні**. Вершы (рыхтуюцца да друку)
4. **Навука вершаваньня**—падручнік для маладых поэтаў і самаадукацыі (рыхтуецца да друку).

Нацыянальная
бібліятэка
Беларусі

# КНІЖНІЦА „МАЛАДНЯК“

ЦБ Усебеларускага Аб'яднаньня поэтаў і пісьменьнікаў Маладняк выдае літаратурна-мастацкія зборнікі (вершы, апавяданьні, крытыка) разьмерам ад аднаго да двух друкаваных аркушаў.

Зборнікі прадаюцца ўва ўсіх лепшых кнігарнях і кіосках Беларусі, а таксама на галоўных станцыях чыгунак, якія праходзяць цераз БССР.

У траўні месяцы 1925 г. вышлі:

1. **Міхась Чарот**—выбраныя вершы.
2. **Ул. Дубоўка**—Там, дзе кіпарысы (*поэма*).
3. **Кузьма Чорны**—апавяданьні
4. **Адам Бабарэка**—апавяданьні.
5. **Язэп Пушча**—Раніца рыкае (*вершы*).
6. **Крапіва**—Асьцё (*сатыры*).
7. **Маладняк**—**Янку Купалу** (юбілейны зборнік).

У чэрвені выйдзе 7 наступных зборнікаў, а ў ліпені 6.

2

Цана 15 к.